**Яканюк Н.П. Народна-інструментальная музычная культура пісьмовай традыцыі ў Беларусі: вопыт сістэмнага аналізу.** — Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2001. — 270 с.

Сучаснае музычнае жыццё Беларусі немагчыма ўявіць без разнастайнай па сваіх вытоках накіраванасці і формах праяўлення народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі, якая на працягу XX ст. сцвердзілася як самабытная, нацыянальна-характэрная мастацкая з’ява. На жаль, нягледзячы на значныя дасягненні музыкантаў рэспублікі — выканаўцаў, кампазітараў, музычных майстроў, выкладчыкаў-метадыстаў, — гісторыя станаўлення і развіцця культуры адзначанага тыпу, а таксама важныя тэарэтычныя праблемы яе мастацкага функцыянавання яшчэ не знайшлі адлюстравання ў айчынным мастацтвазнаўстве. Менавіта гэты прабел запаўняе своечасовая і актуальная манаграфія Н.П.Яканюк "Народна-інструментальная музычная культура пісьмовай традыцыі ў Беларусі: вопыт сістэмнага аналізу", якая абагульняе вынікі дваццацігадовай навуковай работы аўтара. Аўтар даследуе ў сваёй рабоце народныя інструменты скрозь прызму культуры, якая фарміруецца вакол іх. Такі шырокі падыход дае аўтару магчымасць разглядаць у адзінстве складаны комплекс, які ўключае мастацкія каштоўнасці, дзейнасць па іх стварэнні, носьбітаў і рэцыпіентаў культуры. Прычым гэты комплекс вывучаецца на фоне сацыяльнага і мастацкага жыцця краіны, паказаны разнастайныя гістарычныя, палітычныя, ідэалагічныя і іншыя фактары, якія абумоўліваюць яго развіццё.

Н.П.Яканюк даследуе народна-інструментальную культуру як цэласную, адносна самастойную мастацкую сістэму. Функцыянаванне гэтай сістэмы абумоўлена ўстойлівымі дыялектычнымі ўзаемасувязямі паміж яе асноўнымі кампанентамі — музычным інструментам, музыкай, выканаўцам. Аўтар звяртае асаблівую ўвагу на рычагі рэгулявання жыццядзейнасці разглядаемай сістэмы, якія ўключаюць патрабаванні рэцыпіентаў культуры, а таксама дзейнасць адпаведных дзяржаўных і грамадскіх устаноў кіравання, планавання і арганізацыі развіцця культуры. Гэта дазволіла аўтару не толькі паказаць механізм ўнутранага паступальнага руху, але і вылучыць тыя знешнія фактары, якія садзейнічаюць або стрымліваюць развіццё культуры вывучаемага тыпу.

У манаграфіі аналізуюцца вытокі народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі ў Беларусі, раскрываецца гісторыя яе станаўлення і развіцця, вывучаецца дыялектыка суадносін у ёй традыцый нацыянальнага інструментальнага фальклору і агульнаеўрапейскага акадэмічнага інструменталізму. Адзначаючы знешняе падабенства гэтых мастацкіх з’яў, даследчык вызначае прынцыповыя рысы адрознення паміж імі і робіць выснову, што яны не з’яўляюцца тоеснымі, а існуюць у розных прасторава-акустычных умовах і розныя па сваім грамадскім і мастацкім прызначэнні, эстэтыцы і стылістыцы.

Аўтар звяртае асаблівую ўвагу на тое, што народна-інструментальная культура пісьмовай традыцыі належыць да сцэнічнага тыпу. Менавіта гэтым абумоўлены прынцыпова іншыя, чым ў фальклоры, крытэрыі прыгажосці, а значыць, і патрабаванні да якасці гучання народных інструментаў, да рэпертуару і выканальніцкай манеры. Гэтым абумоўлена і неабходнасць мэтанакіраванага фарміравання слухацкай аўдыторыі.

Структура манаграфіі арганічная і адпавядае рашэнню пастаўленых задач. Аўтар не толькі дае шырокі, панарамны агляд гісторыі развіцця народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі ў Беларусі (глава 2), аналізуе яе асноватворныя кампаненты, вылучае і характарызуе атрыбутыўныя тыпалагічныя прыметы (главы 3—5), але і ўздымаецца на новы, больш высокі ўзровень яе асэнсавання, што садзейнічае далейшай распрацоўцы тэарэтычных асноў гэтай культуры.

Абгрунтаванасць вынікаў даследавання забяспечваецца аб’ёмным, дакументальна пацверджаным фактычным матэрыялам, карэктнасцю абраных метадаў, пераканаўчай логікай, а таксама вялікім колам прааналізаванай літаратуры, у якой шырока прадстаўлены работы айчынных і замежных вучоных апошняга дзесяцігоддзя. Безумоўна, фундаментальная гісторыка-тэарэтычная праца Н.П.Яканюк, якая выходзіць далёка за межы традыцыйнай праблематыкі музыказнаўчай навукі, садзейнічае далейшаму плённаму развіццю беларускага мастацтвазнаўства.

***А.Б.Ладыгіна,***
***доктар філасофскіх навук,***
***прафесар***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ